Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 КРАСАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 76 (28440)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



22 красавіка — рэспубліканскі суботнік

СТАР. 3



Міфы і праўда пра «Еўрабачанне»

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, кіраўнік Апарату Савета Міністраў:**

*«На свой зварот чалавек павінен атрымаць зразумелы і вычарпальны адказ, бо многія пытанні можна зняць, дакладна растлумачыўшы канкрэтныя нюансы яго праблемы, каб ён не хадзіў потым па розных інстанцыях. Ёсць пытанні, якія на мясцовым узроўні не ўдаецца вырашыць, напрыклад, узнікае неабходнасць унясення змяненняў у заканадаўчыя акты. Задача службовых асоб у такіх выпадках — дапамагчы чалавеку вырашыць яго праблему, адпаведна, пры неабходнасці — выходзіць на міністэрства, урад з пытаннем аб карэкціроўцы таго ці іншага нарматыўна-прававога акта».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8826 | ▲ |
| Еўра | 2,0208 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0703 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Шчаслівай дарогі, «Белая Русь»!



Фота БЕЛТА.

**У Пінску спусцілі на ваду першы ў краіне круізны цеплаход «Белая Русь». Пакуль яго выпрабоўваюць, а першы рэйс з пасажырамі мяркуецца зрабіць праз тыдзень, 29 красавіка. Рэканструкцыя тэхнічнага судна ў камфартабельны турыстычны карабель вялася па праграме развіцця Прыпяцкага Палесся. А для саміх пінчукоў, асабліва для малых, урачыстая цырымонія спуску цеплахода на ваду была сапраўднай падзеяй. Многія, як Дар'я і Яўген Астроўскія, спяшаліся сфатаграфавацца на фоне сапраўднага круізнага лайнера, які атрымаў жыццё ў іх родным горадзе.**

■ Разумныя грошы

## АКЦЫІ З ДВАЙНЫМ ДНОМ

### Ці такія прывабныя зніжкі, як іх малююць?

**Ну любіць мая жонка набываць усякія тавары амаль на дармаўшчыну. Не, не зусім бясплатна, але каб было так танна, як нідзе. Яна нават цалкам перакананая, што наш сямейны бюджэт яшчэ пакуль і трымаецца дзякуючы яе геніяльным здольнасцям у пошуках якасных і недарагіх прадуктаў і прыроднай беражлівасці. Магчыма, што ў параўнанні са мной (ці з любім іншым мужыком) яна і сапраўды ў цэнах разбіраецца лепш, але ў пагоні за гэтай самай «халявай» можна трапіць у спажывецкую пастку, калі спыніцца набываць абавязкова таннае ўжо вельмі складана. Днямі мы вырашылі прааналізаваць, а што насамрэч нам прапануюць гэтыя самыя шматлікія акцыі гандлёвых сетак з іх зніжкамі і іншымі неймавернымі прапановамі...**

### Вялікі бонус таннасць не гарантуе

Калі праглядаеш маляўнічыя рэкламныя буклеты вялікіх гандлёвых крам, то часам заўважаеш, што зніжкі там на пэўныя тавары дасягаюць 20—30%. Адразу здаецца, што трэба браць, але ўсё не заўсёды так проста. Часцяком крамы першапачаткова вызначаюць цану прапанаванага тавара прыкладна на 25% даражэй, чым у іншых бюджэтных крамах па суседстве. Потым прадукт трапляе пад зніжку па акцыі, і вуаля — крама дае нам значна патаннелы прадукт, але на самай справе добра, калі цана яго будзе недзе на 5% ніжэйшай, чым у іншых. Бывае, што нават і даражэйшай. Уся справа ў тым, якім тут лічыцца стартавы кошт.

Таму я б раіў нашым людзям звяртаць увагу не на памер зніжкі, а на саму цану тавара.

### Знайсці цану за кілаграм і літр

Спачатку раскажу пра тое, як аднаму чыноўніку маленькі кавалачак пірага не прадалі. А гісторыю гэту расказаў **першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ**, выступаючы перад студэнтамі ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, гаворачы будучым спецыялістам аб удасканаленні кантрольнай дзейнасці свайго міністэрства...

СТАР. 4

■ «Зачараваны» патэнцыял

## ЦМОК ДЛЯ ТУРЫСТА

### Як выкарыстаць беларускую міфалогію

**Што ні кажыце, але за апошнія гады Беларусь турыстычная значна прырасла, з'явіліся новыя паслугі—прынады для гасцей нашай краіны: анімацыйныя экскурсіі, разнастайныя фестывалі, адраджэнне старых традыцый і рамёстваў, агратурызм. Што далей?**



Чаму б не папоўніць наш турыстычны арсенал новай «зброяй»— міфалагічнай? Пакуль беларускія легенды і паданні недастаткова выкарыстоўваюцца ў гэтай галіне. Можна прыгадаць толькі маленькі музей міфалогіі і лесу ў Заслаўі, міфалагічную сцежку ў Бярэзінскім запаведніку, фестываль Цмока на Лепельшчыне.

Гаючыя крыніцы, зачараваныя камяні, паселішчы, у якіх царква нібыта правалілася пад зямлю, ці цэлыя вёскі, якія пайшлі пад ваду, мясціны, дзе можна шукаць зданяў і розных пачвар, — вось той «зачараваны» патэнцыял, які пакуль яшчэ недастаткова выкарыстоўваецца ў турыстычнай галіне. Трэба толькі прыдумаць, як гэта прыпаднесці. Пагадзіцеся, мала проста расказаць паданні. Можна выкарыстоўваць анімацыйныя экскурсіі (сёння пры іх дапамозе турыстам «падаюць» гісторыю Беларусі). А можна, знойдуцца крэатыўныя людзі, якія створаць квэсты на аснове сюжэтаў з беларускіх казак і паданняў.

СТАР. 3

# АД АТАМА ДА СПОРТУ

## Супрацоўніцтва з Ніжагародскай вобласцю Прэзідэнт назваў узорным

**Гэтымі днямі з візітам у нашай краіне знаходзіцца дэлегацыя Ніжагародскай вобласці на чале з губернатарам Валерыем Шанцавым. Мэта — вызначыць новыя задачы ва ўзаемадзеянні. З Ніжагародскай вобласцю Беларусь сумесна рэалізуе пяцігадовую Праграму развіцця двухбаковага супрацоўніцтва. І шчыльныя кантакты даюць станоўчыя рэзультаты. Па выніках няпростага ў эканамічным плане 2016 года тавараабарот з гэтым расійскім рэгіёнам вырас на 7,3% і склаў, як падкрэсліў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з гасцямі з Ніжагародчыны, больш чым паўмільярда долараў.**

### Прызнаны вопыт

— Улічваючы той патэнцыял, які маецца ў бакоў, лічу, што ёсць усе перадумовы для нарошчвання аб'ёмаў узаемнага гандлю да ўзроўню 2012 года. У нас ужо тады было 800 мільёнаў долараў, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Для вытворчай кааперацыі створана салідная база. На тэрыторыі Ніжагародскай вобласці налажана зборка беларускіх ліфтаў, адкрыты гандлёвы дом «Белшыны», працуюць дылеры такіх буйных прадпрыемстваў машынабудавання, як «Гомсельмаш», МТЗ, МАЗ і «Амкадор». У сваю чаргу, Беларусь актыўна закупае ў расійскім рэгіёне металапрадукцыю, грузавыя аўтамабілі, тавары хімічнай прамысловасці.

— Мяркую, што той вопыт, які набываюць нашы арганізацыі ў супрацоўніцтве з ніжагародскай кампаніяй «Атамстройэкспарт» пры будаўніцтве Беларускай АЭС, можа быць запатрабаваны пры здзяйсненні іншых энергетычных праектаў, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, гаворачы пра супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам у сферы энергетыкі. Па яго словах, для нас вельмі важна, каб у гэты працэс актыўна ўключалі беларусаў:

— І там працуюць вельмі многія нашы кампаніі, і дагэтуль ніхто не атрымліваў заўваг наконт свайго прафесіяналізму. Гэта значыць, што мы можам будаваць атамныя станцыі па ўсім свеце, і мы будзем там запатрабаваны, таму што, чаго граху таіць, у многіх краінах сёння дэфіцыт рабочай сілы. Наша перавага ў тым, што мы захавалі прафтэхадукацыю, цалкам захавалі, павялічылі і ўзмацнілі базу.

Па словах Прэзідэнта, да нас ужо звяртаюцца іншыя дзяржавы, асабліва постсавецкай прасторы, каб мы дапамаглі падрыхтаваць ім рабочыя кадры.

— А некаторыя — я вось быў нядаўна ў Туркменістане — папрасілі ў іх стварыць сістэму прафтэхадукацыі, адначасова прафесійна-тэхнічную адукацыю... Мы рады, што нашы рабочыя спецыялісты запатрабаваныя. Мы навучыліся многаму і гатовы ўдзельнічаць у любой кропцы свету, разам з расіянамі будаваць падобныя і іншыя аб'екты.

### Аўтобусы і сельская гаспадарка

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што Беларусь падтрымлівае імкненне Ніжагародскага рэгіёна нарошчваць магутнасці аграрнай галіны.

— Мы, як і раней, гатовы аказаць дапамогу ў мадэрнізацыі жывёлагадоўчых комплексаў, пастаўках сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў, — дадаў Аляксандр Лукашэнка, — гатовы выконваць работы пад ключ, калі гэта будзе неабходна.

Па словах Прэзідэнта, ёсць добрыя перспектывы ў сферы транспарту. Беларускі бок можа падключыцца да абнаўлення ніжагародскага парку пасажырскай тэхнікі — з прапановай сучасных гарадскіх аўтобусаў і тралейбусаў розных мадыфікацый.

— Цесныя сувязі ў нас склаліся ў адукацыі, навуцы, культуры, медыцыне, спорце, турызме. Спадзяюся, што з боку кіраўніцтва Ніжагародскай вобласці ўсім ініцыятывам будзе аказана адпаведная падтрымка, — заявіў кіраўнік краіны. — Такія нашы адносіны: Беларусі і Ніжагародчыны — узор для іншых краёў і рэгіёнаў. І наколькі моцнымі будуць гэтыя міжрэгіянальныя сувязі, настолькі моцнымі будуць нашы беларуска-расійскія адносіны.

### Мы цесна звязаныя...

Адносіны і з нашым галоўным эканамічным і палітычным партнёрам у цэлым, і з Ніжагародскай вобласцю ў прыватнасці, у Беларусі традыцыйна добрыя. Тыя праблемныя моманты, якія былі, прэзідэнты абедзвюх дзяржаў вырашылі падчас нядаўняй сустрэчы ў Санкт-Пецярбургу. Нягледзячы на гэта і цяпер знаходзяць месца пэўныя інсінуацыі, калі некаторыя СМІ ў рамках сваёй інфармацыйнай палітыкі абвінавачваюць Беларусь у спажывецкім стаўленні да ўсходняга суседа або нават у русафобскай палітыцы. Прэзідэнт выказаўся наконт несправядлівых абвінавачванняў у адрас нашай дзяржавы.

— Пачынаюць у СМІ з'яўляцца розныя кшталту выдумкі, хто каго там падмануў, што мы зноў на каленях нешта просім у Расіі і гэтак далей. Мы ні перад кім ніколі не стаялі на каленях, вы гэта добра ведаеце. Пісакам асобным і тым, хто выступае на тэлеэкранах, я хачу сказаць, што ў вырабах Беларусі — трактарах, аўтамабілях, усёй машынабудаўнічай галіне, хімічных вырабах, іншых — ад 30 да 90% камплектуючых, сыравіны і матэрыялаў з Расіі.

«Сёння на прадпрыемствах Расіі, якія працуюць на фінішную вытворчасць у Беларусі (вырабляюць камплектуючыя, матэрыялы і іншае), працуе больш за 10 мільёнаў чалавек. Калі мы дапамагаем фінішнай вытворчасці, падтрымліваем, каб яна не спынілася, мы дапамагаем мінімум 10, а то і 15 мільёнам людзей, якія працуюць у Расіі», — заўважыў Прэзідэнт.

Што да расійскіх крэдытаў для Беларусі, то мы плацім за іх 4,5—6% гадавых:

— Усе краіны атрымліваюць пэўныя крэдыты або ад міжнародных арганізацый, або ад дзяржаў. Расія ў нас па гэтых пытаннях не займае першае месца, на ім — Кітайская Народная Рэспубліка, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Яна дала нам крэдытную лінію каля 15 мільярдаў долараў пад праекты, якія рэалізуюцца ў Беларусі, мы яе дагэтуль не выбралі. Самае галоўнае — яны нас не папракаюць у тым, што дапамагаюць нам.

### Не можам ні з кім сварыцца

Што да знешняй палітыкі нашай дзяржавы, то і яна, як ні дзіўна, — адна з любімых тэм для расійскіх крытыкаў.

— Мы цудоўна разумеем сваё месца: мы на Захадзе нікому не патрэбныя, — заявіў Прэзідэнт. — А як мяне любяць на Захадзе, вы памятаеце таксама з тых часоў. Нічога тут не змянілася. А тое, што мы, жывучы ў цэнтры Еўропы, вымушаны праводзіць такую палітыку, каб захаваць краіну і яе бяспеку, суверэнітэт, стабільнасць, каб людзям нармальна жылося... Такое наша жыццё: мы не можам сварыцца ні з Расіяй, ні з Захадам, ні з Украінай, ні з Поўначчу. Наш лёс такі.

Што да выступленняў у адрас беларускай мовы, то і на гэта Аляксандр Лукашэнка даў грунтоўны адказ:

— А тое, што мы не забываем беларускую мову... Дык гэта так і павінна быць. Гэта добра, што ў беларусаў ёсць яшчэ і свая мова. Чаго нас у гэтым папракаць? Хоць у нас пераважная большасць людзей размаўляе па-руску і ў быце ў нас мова зносін — гэта руская мова. Але гэта не расійская мова, я падкрэсліваю, гэта наша агульная з вамі мова... Мы ад яе ніколі не адмовімся, як бы тут нехта нас не штурхаў. Ну і ёсць у нас свая нацыянальная беларуская мова, родная мова беларусаў, якія тут жывуць. Многія яе ведаюць з беларусаў, якія жывуць за межамі нашай краіны. Таму тут усё нармальна і ўсё пад кантролем.

* * *

Губернатар Ніжагародскай вобласці падзякаваў за гасціннасць і заявіў, што Беларусь сёння з'яўляецца ключавым партнёрам у знешняй дзейнасці для яго рэгіёна. Дарэчы, вобласць супрацоўнічае больш чым са 140 краінамі, таму дасягненне сапраўды вялікае. Увогуле ж Валерый Шанцаў ставіць задачу вывесці тавараабарот з Беларуссю на ўзровень у мільярд долараў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Генплан Магілёва адкарэкціраваны

**Гэта зроблена адпаведным указам, які ўчора падпісаў Прэзідэнт. Як паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы, змены ў дакумент унесены з улікам элементаў уладкавання горада, узгодненых падчас рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы ў Віцебскую і Магілёўскую вобласці 14 лістапада 2016 года.**

Генеральны план Магілёва на перыяд да 2025 года распрацаваны на падставе архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі забудовы мікраараёнаў, спецыфікі сацыяльна-эканамічнага развіцця горада, сучаснага стану яго функцыянальных зон і планіровачнай структуры, выкарыстання прылеглых да горада тэрыторый і асноўных транспартных магістраляў.

У межах Магілёва плануецца завяршыць забудову шэрагу жылых раёнаў, уключаючы Казіміраўку, Спадарожнік, Сонечны, а таксама ў межах вуліц Крывуліна — Турава, Стасава — Грышына і іншых.

У забудаванай частцы горада прадугледжваецца завяршэнне фарміравання раёнаў сядзібнага будаўніцтва Грэбнёва, Дары, Дачны, Гародшчына, Сараканайск, па праспекце Шміта, у кварталe вуліц Аграрнай — Слепакурава, а таксама размяшчэнне аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры пераважна ў раёнах новага будаўніцтва.

Прадугледжана комплексная рэканструкцыя жылых тэрыторый, у тым ліку ажыццяўленне зносу трухлявага жылля, вынасу і пераносу шкодных прадпрыемстваў у асобныя перспектыўныя прамзоны, правядзенне мерапрыемстваў па аднаўленні гістарычнай забудовы горада і іншае.

■ Меркаванне

## Важна даць бізнесу больш свабоды

**Сёння Прэзідэнт звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Леанід БРЫЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, лічыць, што адной з асноўных тэм падчас Паслання будзе спрашчэнне ўмоў для вядзення бізнесу.**

— Гэта сапраўды тое, што сёння важна для нашай краіны, для нашай эканомікі, — адзначыў Леанід Брыч. — Гэта тыя меры і тыя дакументы, якія вынесены на ўсенароднае абмеркаванне.

На думку парламентарыя, вельмі важна, каб бізнес менш кантралявалі з боку дзяржавы, каб менш умешваліся ў эканоміку прадпрыемстваў як прыватнага бізнесу, так і дзяржаўнага:

— Каб самі кіраўнікі, уласнікі бізнесу, дырэктары прадпрыемстваў мелі больш правоў самастойна адказваць за тыя дзеянні, якія яны робяць. Што датычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, сапраўды, вельмі сур'ёзнае пасланне павінна быць для самарэалізацыі тых людзей, якія хочуць заняцца сваёй справай. Я думаю, што кіраўнік дзяржавы зверне на гэта сур'ёзную ўвагу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Фінансы

## Насельніцтва здае валюту

### З пачатку года па гэтай лініі казна папоўнілася больш чым на 0,5 млрд долараў

**Статыстыка Нацыянальнага банка краіны сведчыць аб тым, што з пачатку года насельніцтва прадало наяўнай і безнаяўнай валюты на 1,828 млрд долараў у эквіваленце, а набыло — толькі 1,328 млрд долараў. Чысты продаж замежнай валюты фізічнымі асобамі склаў 500,34 млн долараў.**

Аналіз рынку фінансавым рэгулятарам паказвае, што сёлета «юрыкі» прадаюць і купляюць валюту прыкладна ў аднолькавых аб'ёмах. Напрыклад, суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі ў студзені—сакавіку прадалі замежнай валюты на 4,024 млрд долараў у эквіваленце, а набылі — 4,108 млрд (мінус 80 млн). А нерэзідэнты за тры месяцы прадалі валюты на 123,56 млн долараў у эквіваленце, а набылі — 28,38 млн (плюс 95 млн долараў).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Дадатковыя цягнікі на святы

**Усяго ў перыяд з 26 красавіка па 11 мая дадаткова прызначаны 51 цягнік. З іх — 40 саставаў міжрэгіянальных ліній і 11 — міжнародных.**

У святочныя дні будуць курсіраваць цягнікі здвоеных саставаў: №701/702 Мінск—Брэст адпраўленнем з Мінска 1 мая, у зваротным напрамку цягнік адправіцца 2 мая; №748/747 Мінск—Бабруйск адпраўленнем з Мінска і Бабруйска 1, 9 мая; №743 Бабруйск—Мінск адпраўленнем з Бабруйска 26 красавіка і 10 мая; №732/731 Мінск—Орша адпраўленнем з Мінска і Оршы 17, 25-26 красавіка; №734/733 Мінск—Орша адпраўленнем з Мінска і Оршы 25 красавіка і 9 мая; №736/735 Мінск—Орша адпраўленнем з Мінска і Оршы 25 красавіка і 9 мая.

Што датычыцца міжнародных зносін, дадаткова прызначаны цягнікі: Брэст— Масква—Брэст, Мінск—Масква—Мінск. Акрамя таго, у святочны перыяд па Беларускай чыгунцы транзітам будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі №148/147 Масква—Калінінград і №80/79 Санкт-Пецярбург—Калінінград, Гомель—Шчорс—Гомель.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Макрон па апытаннях апярэджвае Ле Пен



Экс-міністр эканомікі Францыі Эмануэль Макрон на тры працэнты апярэджвае лідара партыі «Нацыянальны фронт» Марын Ле Пен перад першым турам прэзідэнцкіх выбараў, сведчаць даныя апытання кампаніі Harris Interactive. Макрона падтрымліваюць 25 працэнтаў выбаршчыкаў, тады як за Ле Пен гатовыя прагаласаваць 22 працэнты французаў. Трэцяе месца падзялілі лідар руху «Няскораная Францыя» Жан-Люк Меляншон і экс-прэм'ер Франсуа Фіён — па 19 працэнтаў галасоў. Як вядома, прэзідэнцкія выбары ў Францыі пройдуць у два туры — 23 красавіка і 7 мая. Усяго на пасаду кіраўніка дзяржавы прэтэндуюць 11 кандыдатаў.

### Пагадненне аб скарачэнні вытворчасці нафты будзе падоўжана

Вытворцы нафты дасягнулі папярэдняй дамоўленасці наконт падаўжэння пагаднення аб абмежаванні здабычы нафты. Пра гэта заявіў міністр энергетыкі Саудаўскай Аравіі Халед аль-Фаліх падчас форуму ў ААЭ. Ён дадаў, што перыяд, на які будзе працягнута пагадненне, не важны, паколькі галоўная яго мэта заключаецца ў дасягненні балансу на рынку. Як вядома, Арганізацыя краін-экспарцёраў нафты (АПЕК) у сакавіку скарачала здабычу нафты больш, чым прадугледжана дамоўленасцямі.

### Міхельсон зноў узначаліў рэйтынг найбагацейшых бізнесменаў Расіі

Forbes другі год запар паставіў на першае месца рэйтынгу найбагацейшых прадпрымальнікаў Расіі саўладальніка найбуйнейшай у краіне прыватнай газаздабыўной кампаніі «Новатэк» Леаніда Міхельсона. Яго капітал выданне ацэньвае ў 18,4 мільярда долараў. Другое месца ў рэйтынгу заняў уладальнік «Северсталі» Аляксей Мардашоў з $17,5 млрд. Трэцяе — уладальнік Наваліпецкага металургічнага камбіната Уладзімір Лісін з $16,1 млрд. Па даных Forbes, за год колькасць доларавых мільярдэраў у Расіі павялічылася з 77 да 96.

### Навукоўцы выявілі планету, на якой тэарэтычна магчыма жыццё



Нябеснае цела знаходзіцца ў сузор'і Кіта, яно значна большае за Зямлю, мае густую атмасферу, а яго паверхня пераважна пакрытая скаламі. Планета, якая атрымала нумар LHS 1140b, размешчана ў 11 разоў бліжэй да свайго свяціла, чым Зямля да Сонца. Аднак яна атрымлівае толькі палову ад таго цяпла і святла, што дасягаецца зямлянам. Таму атмасфера на ёй хутчэй можа нагадваць марсіянскую, чым зямную.

# СІЛЫ — НА ПРЫБОРКУ, ГРОШЫ — НА ДЗІЦЯЧЫЯ ЛАГЕРЫ

### Як мінчане будуць добраўпарадкоўваць свой горад у гэтым годзе?

**22 красавіка пройдзе рэспубліканскі суботнік, які традыцыйна аб'ядноўвае велізарную колькасць сацыяльна актыўнага насельніцтва краіны. Так, у мінулым годзе толькі ў сталіцы ў работах па навядзенні парадку прынялі ўдзел больш за 690 тысяч чалавек і было зароблена 20,75 мільярда недэнамінаваных рублёў (ці 2 мільёны 75 тысяч дэнамінаваных).**

Палова заробленай сумы застаецца ў распараджэнні Мінгарвыканкама і ідзе на захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, месцаў баявой і воінскай славы, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў для дзяцей, пацярпелых ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, другая палова — пералічваецца на рахунак Міністэрства фінансаў. Так летась Мінфін значную частку атрыманых сродкаў перанакіраваў Гомельскаму аблвыканкаму для праектавання і будаўніцтва Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Дарэчы, заканчэнне работ на аб'екце запланавана ўжо на ліпень 2018 года. Плануецца, што сёлета 1,5 мільёна рублёў са сродкаў, зароблены на рэспубліканскім суботніку, будуць накіраваныя на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона.

У сталіцы падчас суботніка ў гэтым годзе мінчане будуць задзейнічаны практычна ва ўсіх буйных скверах і парках, акрамя цэнтральных, а таксама на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу Трасцянец («Вечны агонь»), урочышча Благаўшчына (вёска Малы Трасцянец), воінскага пахавання на Чыжоўскіх могілках, прымуць удзел у рэканструкцыі стадыёна «Дынама», дзе летась працаваў Прэзідэнт, і добраўпарадкаванні Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі.

Сярод асноўных відаў работ тыя, якія не патрабуюць спецыяльнай папярэдняй падрыхтоўкі, — вымятанне смецця, афарбоўка дзіцячага гульнявога абсталявання і малых архітэктурных формаў, апор асвятлення, пунктаў прыпынку, скрыняў, бягучы рамонт асфальтавых пакрыццяў, нанясенне разметкі на вулічна-дарожную сетку, прыборка ўнутрыквартальных тэрыторый, вуліц, зялёных зон, тэрыторый арганізацый, школ, дзіцячых дашкольных устаноў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*




# ПРЫБЯРУЦЬ І ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ВУЛІЦЫ, І ЎСКРАІНЫ

**Кіраўнікі Віцебскага аблвыканкама запланавалі папрацаваць у гэту суботу на тэрыторыі Віцебскага раёна. У рамках праграмы «Чыстыя дарогі» зоймуцца прывядзеннем у парадак абочын каля трасы.**

Летась першыя асобы мясцовай улады працавалі ва Ушацкім раёне. Эпіцэнтрам суботніка быў мемарыяльны комплекс «Прарыў». Ён прысвечаны выхаду з блакады атрадаў Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Адкрыццё комплексу — сімвала гераізму партызан — адбылося ў 1974 годзе. Тады сярод ганаровых гасцей былі Героі Савецкага Саюза У. Лабанок і А. Марэсьеў. З часам, зразумела, спатрэбіўся капітальны рамонт. Што і было зроблена. Рэканструкцыя стала народнай будоўляй. І яе правялі ў параўнальна хуткі тэрмін. Грошы пералічалі грамадзяне, арганізацыі, прадпрыемствы, камерцыйныя структуры. Сродкі зараблялі падчас леташняга і пазалеташняга рэспубліканскіх суботнікаў. У 2016-м, у прыватнасці, накіравалі больш за 4,1 мільярда рублёў (сума да дэнамінацыі). І сёлета на гэтым значным у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны месцы плануецца добраўпарадкаванне.

У абласным цэнтры ў ліку іншага прыбяруць на ўскраіне — на комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі (на балансе «Цэнтра культуры «Віцебск»).

Ахвотныя папрацуюць і ў месцы, дзе ўвекавечана памяць ахвяр лагера смерці «5-ы полк». Мемарыял знаходзіцца на мяжы з Віцебскім раёнам.

У сёлетняй сталіцы Дня пісьменства, Полацку, найбольш важнымі для правядзення суботніка выбраны праспект Скарыны і цэнтральная плошча — Свабоды.

Шмат чаго трэба зрабіць і ў будучай сталіцы абласных «Дажынак» — у Дуброўне. У гэтым райцэнтры будуць працаваць на галоўнай плошчы і ў наваколлях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# 750 ДРЭЎ У ГОНАР МАГІЛЁВА

**Больш за 700 тысяч рублёў плануецца зарабіць на рэспубліканскім суботніку ў Магілёўскай вобласці. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Камітэце эканомікі Магілёўскага аблвыканкама.**

Кіраўніцтва вобласці на чале з губернатарам Уладзімірам Даманеўскім будзе шчыраваць на тэрыторыі абласнога анкадыспансера. Тут плануецца пакласці плітку, разраўняць грунт і азеляніць тэрыторыю. Супрацоўнікі аблвыканкама таксама будуць працаваць на добраўпарадкаванні Падмікольскага і Пячэрскага паркаў, азяляняць вуліцы і скверы Магілёва. Працоўны дэсант адправіцца на загарадныя аб'екты дапамагаць прыводзіць у парадак аздараўленчыя лагеры, дамы-інтэрнаты, лясгас і іншыя аб'екты.

Галоўнай пляцоўкай для кіраўніцтва горада стане будучы парк у раёне Падміколя. Тут закладуць некалькі алей у гонар 750-годдзя Магілёва.

Дарэчы, падчас суботніка ў Падміколлі і іншых куточках Магілёва плануецца высадзіць 750 дрэў — роўна столькі, колькі гадоў спаўняецца сёлета гораду. Сіламі працоўных калектываў будзе наведзены марафет на прылеглых да прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў тэрыторыях, навучэнцы разам з настаўнікамі акультураць свае школьныя двары.

Палова заробленых на суботніку сродкаў па традыцыі будзе пералічана ў рэспубліканскі бюджэт. Другую накіруюць на рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы дзяржустаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, стварэнне і развіццё суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры, падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона ў рэгіёнах. Толькі па Магілёве ў суботніку прымуць удзел не менш за 100 тысяч чалавек, уключаючы студэнтаў, школьнікаў, членаў грамадскіх арганізацый.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Цяпло вернецца на Радаўніцу

### А сёння і заўтра з-за моцнага ветру аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі

**Даволі некамфортнае надвор'е з дажджом і мокрым снегам чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Яна адзначыла, што на гэтым тыдні ў краіне гаспадарыў скандынаўскі антыцыклон, які прынёс да нас халоднае, але пераважна без ападкаў надвор'е. Тэмпературны фон панізіўся і адпавядае другой палове сакавіка. Сёння з раніцы па паўночна-заходняй частцы Беларусі на тэрыторыю краіны завітаюць цыклоны атмасфернага фронту. Таму чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, а таксама моцны парывісты вецер. Удзень будзе воблачна, а максімальная тэмпература паветра складзе 4—10 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 12 градусаў. Асобна сіноптыкі паведамляюць, што ў пятніцу ўдзень у паўночна-заходніх раёнах, а ў суботу амаль паўсюдна па краіне чакаецца ўзмацненне заходняга ветру парывамі да 15—20 м/с. Таму ў гэтыя два дні ў нас аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі.

У многіх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў суботу, раніцай і ўдзень па паўночным захадзе з мокрым снегам. Аднак стане цяплей. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, а ўдзень — ад плюс 4 да плюс 11 градусаў. Чакаецца, што ў нядзелю ў Беларусь ізноў прыйдуць атмасферныя франты і больш халодныя паветраныя масы. Уначы пераважна ў паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж і мокры снег). Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, удзень — 3—10 градусаў вышэй за нуль. Захаваецца няўстойлівае надвор'е і ў панядзелак. Уначы па паўночна-ўсходняй частцы краіны пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Удзень па заходнім рэгіёне краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ў панядзелак складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 5 да плюс 11 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у аўторак на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць цёплыя вільготныя паветраныя масы з паўднёвага захаду Еўропы, а ў паўночна-заходніх рэгіёнах краіны адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў. Менавіта таму па паўночным захадзе чакаюцца дажджы. Пацяплее. Уначы тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, а ўдзень сонейка прыгрэе нават да 10—17 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# ЦМОК ДЛЯ ТУРЫСТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, народ паехаў на Дзеда Мароза, але ж падобныя зімовыя чараўнікі ёсць і ў іншых краінах. Чаму б нам не пашукаць у сваёй міфалогіі і іншых персанажаў? Прычым выкарыстоўваць іх не толькі для забаўлявання замежных гасцей, а найперш для развіцця ўнутранага турызму. Не кожны беларус можа сабе дазволіць паехаць у Румынію да Дракулы, ці ў Вялікабрытанію, каб шукаць Лахнэскую пачвару. Але свае вампіры ды ваўкалакі сустракаюцца і ў беларускіх легендах. Праўда, яны не такія крыважэрныя, як у суседзяў — на Беларусі няма паданняў і казак пра вёскі, пакусаныя вампірамі. Ёсць у нас і пярэваратні, і нават кентаўры (напалову людзі, напалову коні — Вазіла і Кумяльган). Ды і русалкі і кікімары ў беларусаў з асаблівасцямі. Так, нашы русалкі не абавязкова з хвастом — яны бегаюць па палях, гушкаюцца на арэлях і качаюцца ў жыце. А кікімары — гэта не жахлівыя цёткі на балоце, а свавольныя дзяўчынкі (па паданнях імі становяцца памерлыя нехрышчоныя ці загубленыя дзеці), якія часта псуюць працу гаспадынь.

Трэба падумаць і куды пасяліць беларускага цмока. Насамрэч, на Беларусі ёсць мясціны, дзе па паданнях жыла гэта істота, напрыклад, у вёсцы Гогалеўка ў вялізным камені. Але перш, чым раскручваць міфалагічную тэму, трэба падумаць, як увязаць гэта з ужо існуючымі турыстычнымі маршрутамі.

А чаму не выкарыстоўваецца наш народны каляндар? Прыкметы, павер'і, святы — добрая крыніца, з якой можна чэрпаць «смачную» інфармацыю для аматараў чароўнага свету. Успомнім Узвіжанне, Русальчын тыдзень, і, канешне, Купалле. Тут і тэмы для цікавых расповедаў, і правядзенне самога свята, а якую шыкоўную можна зрабіць «сувенірку». На жаль, сярод падобнай прадукцыі тэма міфалогіі слаба прапрацавана. Турысты вязуць ад нас саламяных лялек і фігуркі зуброў, а ці трапляюцца ім калі сувенір, прысвечаны адной з самых прыгожых і вядомых легендаў Беларусі — папараць-кветка?

Напэўна, да раскруткі міфалагічнай спадчыны трэба падключаць не толькі прадстаўнікоў турыстычнай галіны. Калі наша міфалогія будзе часцей «эксплуатавацца» беларускімі дзіцячымі пісьменнікамі і малыя будуць ведаць сваіх персанажаў, можа, бацькі павязуць іх знаёміцца з беларускім чароўным светам, а не нейкімі тролямі ці эльфамі ў замежных казачных музеях.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*


## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о повторном открытом аукционе со снижением цены по продаже имущества, обращенного в доход государства (4-комнатная квартира, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, д. 19, кв. 68)**

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|
| Лот №1 **Изолированное помещение с инв. №500/D613853**. Назначение: квартира. Адрес объекта: г. Минск, ул. Жуковского, д.19, кв. 68. Кол-во жилых комнат – 4. Год постройки – 1998. Этаж – 6. Общая площадь – 77,2 кв. м. Жилая – 51,0 кв. м. Технические характеристики (по данным технического паспорта): стены наружные, стены внутренние и перегородки – ж/б панели; перекрытия ж/бетонные; полы – линолеум, плитка, ДСП, проемы – оконные двойные окрашенные, двери щитовые окрашенные, лоджия – есть; отопление, водопровод, канализация – имеются, горячее водоснабжение – центральное; радио, телевидение, телефон – есть, мусоропровод, лифт – есть. На праве собственности | 123 120,00 | 12 310,00 | 5% |

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

ОБРЕМЕНЕНИЕ

Постановление об аресте СК РБ от 19.06.2014 №б/н (арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов))

**Аукцион состоится 17.05.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (квартира) (Лот № 1), проводимом 17 мая 2017 г. (Октябрьский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 15.05.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Ткачев Максим Анатольевич, тел. 8 (029) 637-37-19 (пн. – пт. с 9.00 по 18.00).
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

# АКЦЫІ З ДВАЙНЫМ ДНОМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зазірнуў днямі першы намеснік міністра ў адну мінскую кавярню гарбаты папіць і з'есці чаго-небудзь. Папрасіў адрэзаць невялікі кавалачак пірага. А яму прапанавалі купіць чвэрць, вагой 250 грамаў. Як так, падумаў работнік гандлю, у краме кліенту адрэжуць такі кавалачак каўбасы, які ён захоча, а тут гэты алгарытм ужо не працуе? А работнік кавярні паведаміў упартаму спажыўцу, што такі існуе парадак ва ўсіх падобных установах горада, ёсць нават пэўная інструкцыя. А супраць яе і адказаць няма чаго. Таму Артур Карповіч пасля гарбаты вярнуўся ў міністэрства і даў заданне сваім падначаленым разабрацца ў гэтай сітуацыі так, каб нам з вамі любы кавалак пірага «ў рот залез».

Я тут пра што? У гандлі сёння назіраецца шмат станоўчых перамен, але ёсць і хібы, з якімі можна змагацца. Напрыклад, пытанне ў мяне з расфасоўкай тавараў менавіта вытворцам. Раней крупы былі ў пакеціках па кілаграме, а цяпер усё больш па 800 грамаў, а часам і ўвогуле 700. Тое ж самае назіраецца з алеем, дзе тара з літра ў асобных вытворцаў паменшылася да 850 мілілітраў, а днямі я бачыў бутылёк гэтага прадукту ёмістасцю 680 мілілітраў. Самае цікавае, што такая бутэлька алею візуальна амаль не адрозніваецца ад стандартнай у цэлы літр. Можа, толькі крыху «худзейшая». І каштуе такі алей, зразумела, танней, але магазіны часцяком выстаўляюць такі тавар «па акцыі». А на самай справе, у пераліку на літр, падобны алей танным не з'яўляецца. Нешта падобнае сёння назіраецца з фокусамі фасоўкі ў нестандартную тару сокаў, мінеральнай вады, квасу і нават малака і кефіру. Тара і сапраўды можа быць рознай, каб задаволіць усіх спажыўцоў, але кліент павінен ведаць, па якім рэальным кошце (за стандартную адзінку) яму прапануюць гэты тавар.

Каб не разгубіцца ў падобнай разнастайнасці фасоўкі, мая жонка, напрыклад, бярэ з сабою ў магазіны калькулятар. Або яшчэ дома па рэкламных паперках падлічвае сапраўдную цану прадуктаў у кілаграмах і літрах. Згадзіцеся, што далёка не ўсе гаспадыні будуць гэтым займацца. Адзначу, што галіновае міністэрства сёлета збіраецца навесці пэўны парадак і па гэтым пытанні. Яно ўжо сёння рэкамендуе на цэнніках падаваць кошт тавару за кілаграм і літр. Пакуль толькі рэкамендуе.

## Пра тэрмін прыдатнасці і склад прадукту

Існуе ў многіх гандлёвых сетак сёння яшчэ і такая акцыя, як продаж адразу некалькіх адзінак тавараў, калі адзін з іх вам прапануецца бясплатна. Сама прапанова сапраўды цікавая, але і тут існуюць пэўныя нюансы. Звычайна цана аднаго прадукта ў такой акцыі максімальная, а калі скласці з бясплатным, а потым падзяліць на агульную колькасць тавараў, то сярэдняя цана адзінкі будзе і сапраўды таннейшай. Гэта апрыёры павінна быць танней, што на практыцы яшчэ далёка не факт. Магчыма, гэта так, тады ўзнікае другое пытанне наконт таго, ці сапраўды вам трэба мець прадукт у такой колькасці? Згадзіцеся, што не заўсёды.

На падобную рэпліку мая жонка адказвае, што стратэгічны запас нам не перашкодзіць, бо сям'я вялікая. Магчыма, гэта так, але... Набыла яна па такой акцыі дзве вялікія бутэлькі кетчупу. Першапачаткова тэрмін прыдатнасці такога тавару складае недзе шэсць месяцаў. Дык вось, кетчуп па акцыі быў сапраўды смачным, але не зусім свежым, бо тэрмін яго прыдатнасці канчаўся ўжо праз 20 дзён. За гэты тэрмін адну бутэльку мы абавязкава з'ядзім, а вось другая, бясплатная, «пойдзе», мабыць, у сметнік. Ну, і навошта нам такая «цудоўная» акцыя?

Яшчэ адной нагодай для нашых спрэчак сталі катлеты, якія жонка прыгатавала з магазіннага фаршу. А нашы дзеткі іх забракавалі. Чаму? Фарш быў набыты ў краме па акцыі і называўся «Свіны-люкс». Калі потым я ўважліва пачытаў склад гэтага паўфабрыкату, то ўбачыў, што там не толькі свіное мяса, цыбуля і морква, але і курыная скура. Сюрпрыз нам атрымаўся яшчэ той, бо малыя гэтую скуру есці не будуць ні пад якім «соусам». Потым я спецыяльна пахадзіў па крамах і даведаўся, што ў свіныя ці дамашнія фаршы з паметкай «Супер», «Экстра», «Люкс» і г. д. магазінныя кухары могуць пакласці любыя харчовыя дабаўкі. Дакладная рэцэптура падобных паўфабрыкатаў нам не вядомая. Вось вам і акцыя з двайным дном атрымалася.

## Рыба з вадой

Мы ўжо пісалі пра філе рыбы, якое прадаецца ў воднай глазуры. Гэтая вада ацэньваецца звычайна ў працэнтах да ўсёй масы прадукту. Бывае ад 5 да 40% і нават да 50. Тут усё зразумела. Бярэш і вывучаеш этыкетку, а потым выбіраеш філе з прымальнай для цябе доляй вады. Аднак цяпер у асобных гандлёвых сетках, якія прадаюць рыбу, ваду могуць нам прадаць не толькі разам з філе.

Гэта таксама нейкі «фінт» з акцыямі. Сабраўся я днямі купіць скумбрыю, а па акцыі яна значна таннейшая. У пакеціку цудоўныя вялікія рыбіны, але яны былі на дзіва роўнымі і гладкімі. Ужо дома мы заўважылі, што кожная рыбіна пакрыта тоненькім пластом лёду. Пасля размарозкі вады нацякло не шмат, але яна сапраўды была. У мяне асабіста склалася ўражанне, што ў цэху замарозкі гэтую рыбу спецыяльна апырсквалі. Калі гэта так, то пасля падобнай аперацыі рыба стала важыць больш, а таму і па акцыі яе можна прадаваць танней.




## Алкаголь у інтэрнэт не пойдзе

Агрэсіўная рэклама алкагольных напояў у крамах у нас забаронена. Не існуе і акцый па гэтых таварах, але кропка тут яшчэ не пастаўлена. У буйных гандлёвых аб'ектах асобныя віды гарэлкі, віна і піва з мінімальнымі коштамі выстаўляюцца на зале менавіта ў самых «рыбных» месцах. Мне здаецца, што і тут існуюць пэўныя прыкметы выкарыстання спецыяльных умоў, якія падштурхоўваюць спажыўцоў купляць гэтыя напоі. Спадзяюся, што адпаведныя структуры звернуць і на гэта ўвагу.

Сёння больш цікавіць іншае пытанне. Асобныя гандлёвыя сеткі пачалі даволі актыўна лабіраваць магчымасць продажу алкаголю праз глабальнае сеціва. Каментарый па гэтай тэме нам даў Артур Карповіч. Па яго словах, рэалізацыю алкаголю праз інтэрнэт у міністэрстве лічаць не найлепшай схемай продажу такога прадукту. У гандляроў можа ўзнікнуць шмат спакус. «У нас і так часам алкаголь прадаецца па падобнай схеме нелегальна. Мы адсочваем сітуацыю, робім кантрольныя закупкі, пасля чаго сігналізуем у праваахоўныя органы, — сказаў Артур Карповіч. — Калі дазволіць рабіць гэта легальна, то можа хлынуць паток фальсіфікаванай гарэлкі з Расіі. Заўважу, што ў гэтай краіне, паводле афіцыйнай статыстыкі, у гандлі знаходзіцца каля 50% падробленай гарэлкі. І з гэтым яны нічога не могуць зрабіць. Таму меркаваннне нашага міністэрства адназначнае — цяпер наша грамадства пакуль не гатовае для рэалізацыі алкаголю і тытуню праз інтэрнэт».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


УНП 100008115

## «Годовой отчет эмитента ценных бумаг»

**Полн. наименование: Открытое акционерное общество «МАПИД»**
**Адрес: 220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205**
**Полное Ф.И.О. руководителя: Милошевский Николай Викторович**
**Полное Ф.И.О. главного бухгалтера: Цыбульская Елена Владимировна**
**Основные виды деятельности: строительство**
**Единица измерения тыс. руб.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2016 года

| АКТИВ | Код. стр. | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| *I. Долгосрочные активы* | | |
| Основные средства | 110 | 103 366 |
| Нематериальные активы | 120 | 109 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 35 340 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 63 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 6 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 578 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 1 |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **139 463** |
| *II. Краткосрочные активы* | | |
| Запасы | 210 | 39 681 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 554 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 536 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 47 610 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 3 400 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 215 |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | **91 996** |
| **БАЛАНС** | **300** | **231 459** |
| **Собственный капитал и обязательства** | | |
| *III. Собственный капитал* | | |
| Уставный капитал | 410 | 68 462 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - |
| Резервный капитал | 440 | 5 429 |
| Добавочный капитал | 450 | 45 071 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 43 699 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | **162 661** |
| *IV. Долгосрочные обязательства* | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 944 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 50 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 10 621 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | **12 615** |
| *V. Краткосрочные обязательства* | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 789 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 39 028 |
| Обязательства,предназначенные для реализации | 640 | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 15 110 |
| Резервы предстоящих расходов | 660 | 254 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 2 |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | **56 183** |
| **БАЛАНС** | 700 | **231 459** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2016 г. по 31 декабря 2016 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции,товаров, работ, услуг | 010 | 244 508 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 218 722 |
| **Валовая прибыль** | 030 | **25 786** |
| Управленческие расходы | 040 | 4 532 |
| Расходы на реализацию | 050 | 940 |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции,товаров, работ, услуг** | 060 | **20 314** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 6 985 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 20 176 |
| Прибыль по текущей деятельности | 090 | 7 123 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4 038 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 4 295 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 067 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 1 299 |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | 140 | **- 489** |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 6 634 |
| Налог на прибыль | 160 | 5 327 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 6 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 1 326 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | 190 | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли | 200 | 1 |
| **Чистая прибыль** | 210 | **2 638** |

| | | |
|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | чел. | 6 500 |
| в том числе: юридических лиц | чел. | 4 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | чел. | нет |
| в том числе: физических лиц | чел. | 6 496 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | чел. | нет |
| Доля государства в уставном фонде (коммунальная) | % | 94,0135 |
| Начислено на выплату дивидендов за отчетный период | тыс. руб. | 2 845,48 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,2577 |
| Обеспеченность акций имуществом Общества | руб | 14,73 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | нет |
| Среднесписочная численность работающих | чел. | 5 918 |
| Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год | 29 марта 2017 года | |
| Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | общее строительство зданий | |
| Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения | применяется | |

Генеральный директор ОАО «МАПИД» Н.В. Милошевский

Главный бухгалтер ОАО «МАПИД» Е.В. Цыбульская

### Аудиторское мнение

ООО «АудитИвестКонсалт» полагает,что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о том, что консолидированная бухгалтерская отчетность ОАО «МАПИД» достоверно во всех существенных аспектах отражает его финансовое положение по состоянию на 01.01.2017, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения за 2016 год в соответствии с применимой основой составления представления отчетности и соответствии во всех существенных отношениях совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.



## Извещение о проведении повторного аукциона

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9 | | |
| **Вид аукциона** | Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества) | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Лот №** | **Наименование, общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **1** | **Гараж №351,** 15,9 кв. м | 500/D-14128 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 351 |
| **2** | **Гараж №423,** 15,3 кв. м | 500/D-14180 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 423 |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 8 051,66 BYN** | | **Шаг понижения цены: 402,58 BYN** | |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 6 038,76 BYN** | | **Шаг повышения цены: 402,58 BYN** | |
| **3** | **Гаражи на 4 автомашины,** 89,3 кв. м | 102/С-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,0245 га предоставлен Продавцу на праве аренды до 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 8 875,06 BYN** | | **Шаг понижения цены: 443,75 BYN** | |
| **Минимальная цена – 7 987,56 BYN** | | **Шаг повышения цены: 443,75 BYN** | |
| **Лот №** | **Наименование** | | **Адрес** |
| **4–13** | **Машино-место №121, №123, №127, №129, №131, №132, №133, №136, №137, №138** | | г. Минск, пр-т Независимости, 168/3-1г |
| Лоты №№4–13 расположены в подземной автостоянке, общ. пл. 6299,0 кв. м с инвентарным №500/D-70793116 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 24 057,00 BYN** | | **Шаг понижения цены: 1 202,85 BYN** | |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 18 042,75 BYN** | | **Шаг повышения цены: 1 202,85 BYN** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи по всем Лотам: 30** рабочих дней после проведения Продавцом корпоративных процедур по согласованию заключения сделки (в случае заключения договора купли-продажи с единственным Покупателем, признанным единственным участником торгов). В ином случае – **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Информация по внесению задатка** | | | |
| **Задаток** перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»:<br>- по Лотам №№1–2 в сумме **1 515,00 BYN** по каждому Лоту.<br>- по Лоту №3 в сумме **1 670,00 BYN**.<br>- по Лотам №№4–13 в сумме **2 970,00 BYN** по каждому Лоту | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя. До внесения задатка участники аукциона в обязательном порядке знакомятся с проектом договора купли-продажи | | | |
| Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона в г. «Звязда» от 30.03.2017 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.05.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **03.05.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. auction@cpo.by; www.cpo.by** | | |

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Руку на пульт

# Шоу, бізнес і прафесійная школа

## Міфы і праўда пра «Еўрабачанне» вачыма тых, хто ведае конкурс знутры

**62-і міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2017», на жаль, не стане рэкордным па колькасці ўдзельнікаў — Украіна прыняла канчатковае рашэнне пра забарону ўезду расійскай удзельніцы, а Еўрапейскі вяшчальны саюз не знайшоў выйсця, якое задаволіла б усе бакі. У тэлевізійных і музычных кулуарах адразу пайшлі размовы: маўляў, усё, шоу скончылася, цяпер рэй вядзе палітыка, і ці трэба ў сённяшніх умовах выдаткоўваць столькі грошай, сіл і часу на той праект? Пра тое, што нам дае членства ў ЕВС, навошта беларусам «Еўрабачанне» і як насамрэч ставяцца да гэтага шоу ў свеце, «Звязда» распытала прадстаўнікоў Белтэлерадыёкампаніі — намесніка генеральнага прадзюсара медыяхолдынга Вольгу ШЛЯГЕР, якая з 2013 года курыруе нацыянальны адборачны тур «Еўрабачання» ў Беларусі, і намесніка кіраўніка галоўнай дырэкцыі «Беларусь 1», каардынатара праектаў Белтэлерадыёкампаніі і ЕВС Вольгу САЛАМАХУ.**

***— «Еўрабачанне-2017» яшчэ не адбылося, але ўжо ўвайшло ў гісторыю з прэцэдэнтам: упершыню краіна-гаспадыня конкурсу не пусціла на яго аднаго з удзельнікаў. На ваш погляд, як гэта адаб'ецца на рэпутацыі і рэйтынгах шоу?***

— Ніхто не спрагназуе, як паводзіць сябе іншыя ўдзельнікі і што будзе з конкурсам налета — спад цікавасці або, наадварот, усплёск, — заўважае Вольга Шлягер. — Мы можам толькі шкадаваць, што не будзе аднаго з удзельнікаў.

## КАЛІ ПРАЦА — ЗАДАВАЛЬНЕННЕ

Беларусы, са свайго боку, да конкурсу практычна гатовы — 1 мая нашы ўдзельнікі вылятаюць у Кіеў, а 3 і 6 мая ўжо правядуць першыя рэпетыцыі на сцэне і дадуць прэс-канферэнцыі для еўрапейскіх СМІ. Урачыстае адкрыццё «Еўрабачання» адбудзецца 7 мая, а 9, 11 і 13 пройдуць паўфіналы і фінал шоу. Падрабязны ж графік неабходных спраў і мерапрыемстваў складаецца ўжо непасрэдна падчас конкурсу, карэктуецца і ўзгадняецца з дэлегацыямі штодня і, як запэўніваюць у адзін голас Вольга Шлягер і Вольга Саламаха, звычайна атрымліваецца такі насычаны, што ледзь хапае часу на перакусы і тым больш экскурсіі па горадзе.

***— За апошнія гады якая з краін-гаспадынь конкурсу найбольш парадавала арганізацыяй і камфортам для ўдзельнікаў?***

— Вельмі добра было ў Мальмё, куды мы ездзілі з Алёнай Ланской (у 2013 годзе. — **Аўт.**). Усё было настолькі зладжана, дакладна і зразумела, што працавалася ў задавальненне. У прынцыпе, тое самае магу сказаць і пра Капенгаген, і пра Вену — арганізацыя шоу, якой займаецца міжнародная каманда спецыялістаў, заўжды на ўзроўні, хіба толькі па клімаце адны гарады больш прыемныя, другія менш камфортныя.

— Вельмі добра было ўсё арганізавана летась у Стакгольме, бо сама арэна знаходзілася за хвіліну хады ад гасцініцы — сцяна атэля, можна сказаць, плаўна пераходзіла ў арэну. Такая лагістыка дазваляла сэканоміць шмат часу. Акрамя таго, упершыню быў зроблены так званы праглядны пакой, дзе мы бачылі, як выглядае выступленне на тэлеэкране, і нават пасля генеральнай рэпетыцыі можна было ўнесці патрэбныя папраўкі.

***— Беларусь удзельнічае ў «Еўрабачанні» ўжо 14-ы год, але спрэчкі вакол статусу конкурсу так і не сціхаюць. Адны заклікаюць перастаць збірацца на еўрасцэну, як на вайну, другія нагадваюць пра аўдыторыю ў некалькі соцень мільёнаў чалавек, трэція паблажліва заўважаюць, маўляў, ніхто, акрамя хатніх гаспадынь і гей-супольнасці, даўно гэта шоу не глядзіць... З вашага досведу, як насамрэч еўрапейцы ставяцца да «Еўрабачання»?***

— Асабіста я таксама мяркую, што «Еўрабачанне» — гэта не музычная Алімпіяда, а проста творчае спаборніцтва, безумоўна, вельмі папулярнае ў Еўропе, але не адзінае, а адно з шэрагу, — падкрэслівае Вольга Шлягер. — Прайсці падрыхтоўку з высокакласнымі спецыялістамі, убачыць, як працуюць міжнародныя піяр-механізмы, працаваць на сцэне такога ўзроўню, аснашчанай найсучаснейшым музычным і тэлевізійным абсталяваннем, — ад усяго гэтага, на мой погляд, трэба атрымліваць задавальненне. І яшчэ ўсмоктваць, як губка, новыя веды, бо па насычанасці гэтыя некалькі месяцаў — як вучоба ў некалькіх інстытутах. Што да стаўлення саміх еўрапейцаў, якое я бачыла, — яно заўжды вельмі цёплае і прыязнае.

— «Еўрабачанне» — вельмі сур'ёзны тэлевізійны праект. Можна гаварыць усё, што хочаце, але яго аўдыторыя — 204 мільёны гледачоў. А само шоу трансліююць такія медыягіганты, як BBC, французскія кампаніі TF1, TF2, яго глядзяць не толькі ў Еўропе, але і ў Аўстраліі, і ў ЗША. Рэйтынгі конкурсу, асабліва ў маленькіх краінах, найвялікшыя — напрыклад, на Мальце яго глядзяць 95% насельніцтва! І ў плане арганізацыі да гэтага музычнага праекта ставяцца надзвычай адказна, фактычна як да Алімпіяды — шэраг міжнародных спецыялістаў, якія працуюць у аргкамітэце, якраз і займаюцца Алімпійскімі гульнямі і Нобелеўскімі прэміямі. На «Еўрабачанні» заўжды прадстаўлены самыя крутыя тэхнічныя навінкі ў сэнсе гуку, святла, афармлення і г. д. Так што гэта мерапрыемства вельмі высокага ўзроўню.



Вольга САЛАМАХА з беларускім канкурсантам Сашам МІНЁНКАМ на дзіцячым «Еўрабачанні» 2016 года.

## ЧАМУ НЕ ПЕРАМАГАЕМ

***— Што б мы ні казалі, але пераможцы на «Еўрабачанні» хочацца. Але пакуль што найвялікшым дасягненнем Беларусі застаецца выступленне Дзмітрыя Калдуна ў 2007-м. Чаму так — мы не трапляем у фармат (калі наогул выпадае казаць пра фармат гэтага конкурсу) або проста не шанцуе?***

— Не ўсе ж краіны, якія едуць на конкурс, выйграюць яго, — па-філасофску пацікае плячыма кіраўнік нацыянальнага адбору. — Многія проста выходзяць, спяваюць на сваёй мове і атрымліваюць задавальненне, а вынік іх, прабачце, «не парыць». Пераможцы, безумоўна, хочацца, але мы маленькая краіна, і «Еўрабачанне» для нас — перш за ўсё добрая школа. Чаму не перамагаем? Напэўна, таму што многія не разумеюць, колькі насамрэч давядзецца вучыцца і працаваць. Тую ж Алёну Ланскую, да якой многія крытыкі выказвалі прэтэнзіі, я запомніла як працаздольнага і дысцыплінаванага артыста — да такой ступені аратага, што многім і не снілася. Юра Вашчук, Тэа, у якім спалучыліся высокі прафесіяналізм і найлепшыя чалавечыя якасці, — тая ж гісторыя, ён умее працаваць у камандзе. Як вынік — памятаем, абодва гэтыя ўдзельнікі прайшлі ў фінал конкурсу. Калі ж кантакту няма, ёсць толькі канфлікт, то на што можна разлічваць?

***— Ці не час нешта змяніць у кансерваторыі — маю на ўвазе нацыянальны адбор? Можа, варта нeяк падштурхнуць нашых артыстаў — дапусціць да адбору замежных легіянераў, як было калісьці, або ўлічваць ацэнкі міжнароднага журы, або наогул прызначыць удзельніка закрытым чынам?***

— На працягу некалькіх гадоў Белтэлерадыёкампанія ў рэжыме анлайн транслюе праслухоўванне прэтэндэнтаў, якое, напэўна, вы таксама глядзелі і бачылі ўдзельнікаў. Многія з іх прыходзяць на адбор толькі дзеля піяру, бліснуць у шоу, на якое яны прэтэндуюць, з «Хвілінай славы» ці нейкімі іншымі праектамі. Наогул, мы ўпіраемся ў тое, што ўсе чагосьці чакаюць: што нехта прыйдзе і зробіць іншы адбор, з іншымі правіламі і крытэрыямі — падладзіцца пад нас, пад тое, што мы можам. Не, спадарства, не конкурс трэба падцягваць да сябе, а самім цягнуцца да яго ўзроўню. Тады ў гэтым будзе сэнс. Займіцеся, у рэшце рэшт, справай, напішыце класную песню, а не абвінавачвайце журы, што ўсё загадзя падлічана і размеркавана. Але, на жаль, многім лягчэй дапякаць мяне бясконцымі званкамі, каментарыямі, словам, нейкімі глупствамі, а не паказаць сябе на справе. І хоць шкада марнаваць час на праслухоўванне некаторых «шэдэўраў», але вельмі хочацца не прапусціць кагосьці новага і перспектыўнага, як галасістая, зусім юная дзяўчына Саша Ткач або цікавы хлопец Мікіта Ходас, якія былі сёлета ў фінале.



Вольга ШЛЯГЕР кіруе праектам «Еўрабачанне» ў Беларусі» ўжо 5 гадоў і ведае ўсе нюансы.

## НЕ БІЗНЕСАМ АДЗІНЫМ

***— Раней Беларусь вельмі любіла рабіць шыкоўныя прома-пакеты і запрашаць міжнародную каманду для падрыхтоўкі сваіх артыстаў. Што цяпер?***

— Белтэлерадыёкампанія ў гэтым годзе з'яўляецца адзіным прадзюсарам «Naviband», таму мы аплачваем усё. Ёсць тытульны партнёр, які прапанаваў прома-прадукцыю — чахлы для тэлефонаў, сумкі, майкі з беларускай сімволікай. Дарэчы, у адзіным нацыянальным стылі будзе апранута ўся дэлегацыя, каб нас было добра відаць на тэлекамеру. З намі таксама звязалася майстар, здаецца, з Полацка, якая вельмі прыгожа вышывае на аршанскім ільне, асобна заказалі ў рамеснікаў значкі з вышыўкай — сімвалы з арнаменту і лагатып «Naviband». Словам, вязём усё тое, што сярод прыхільнікаў «Еўрабачання» карыстаецца попытам і дакладна трапіць у іншыя краіны як добры напамін пра Беларусь. Што датычыцца каманды, то яна зноў інтэрнацыянальная, але гэтым разам хутчэй славянская. Праўда, нас зноў кансультаваў педагог па вакале з Кіпра Алекс Панаі: некаторыя беларускія словы ў песні перакліканоцца з ненарматыўнымі слоўцамі з англійскай, і ён падказаў, што рабіць, каб вынішчыць гэта падабенства.

***— Адно з балючых пытанняў, якое датычыцца «Еўрабачання», — фінансавае. Шмат разоў гучалі заклікі, маўляў, нічога не дасягаем, значыць, трэба эканоміць бюджэтныя сродкі і не ўдзельнічаць наогул. Ці насамрэч узнос у ЕВС аплачваецца з бюджэту і які, хоць бы прыблізна, яго памер?***

— У ЕВС дзейнічае правіла: чым большая краіна, тым большы яе ўзнос. І, дарэчы, нават калі мы не будзем удзельнічаць у «Еўрабачанні», то павінны плаціць за трансляцыю конкурсу, — заўважае Вольга Шлягер. — А як інакш — калі мы не будзем гэтага бачыць, удзельнічаць, спрычыняцца да агульнаеўрапейскага руху, то дзе мы будзем вучыцца?

— Вялікую частку выдаткаў на «Еўрабачанне» выплачвае Белтэлерадыёкампанія са сваіх прыбыткаў ад камерцыйнай дзейнасці, — падкрэслівае Вольга Саламаха. — Узносы залежаць ад памеру тэлекампаніі, яе стабільнасці на рынку, яшчэ ад шэрагу фактараў, але яны насамрэч вялікія — для нас гэта сума ў еўра з пяццю нулямі. Ці варта Беларусі ў гэтым удзельнічаць? Мяркуйце самі: мы, як кампанія-вяшчальнік, член ЕВС, атрымліваем 6 гадзін прамога эфіру. Шоу мае высокія рэйтынгі, яго актыўна глядзяць па тэлебачанні і ў інтэрнэце, і для Беларусі гэта адна з самых сур'ёзных і важных культурных падзей. Акрамя таго, партнёрства з ЕВС — гэта далёка не толькі конкурсы, але і міжнародны абмен навінамі, і прафесійныя трэнінгі для юрыстаў і супрацоўнікаў тэлебачання, і шэраг іншых праектаў, па якіх мы супрацоўнічаем.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*tselyashuk@zviazda.by*

### Ці ведалі вы, што...

- ✔ У 2015 годзе «Еўрабачанне» трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса як доўгажыхар сярод штогадовых тэлевізійных конкурсаў.
- ✔ «Еўрабачанне» — гэта не толькі дарослае і дзіцячае песенныя спаборніцтвы, але яшчэ і конкурсы маладых танцораў, музыкантаў і міжнароднае харавое шоу (у першых двух Беларусь удзельнічала, але яны выклікалі малую цікавасць у гледачоў і саміх артыстаў).
- ✔ Пасля конкурсу 2017 года фанатэка «Еўрабачання» складзе 1479 песень агульнай працягласцю амаль у 72 гадзіны.
- ✔ Лідары конкурсу па колькасці перамог — Ірландыя (7), Швецыя (6), Люксембург, Францыя і Вялікабрытанія (па 5).
- ✔ «Наркаманам Еўрабачання» арганізатары шоу жартоўна прызналі нямецкага кампазітара-песенніка Ральфа Зігеля, чые песні гучалі на конкурсе 21 раз — а сёлета будзе 22-і.

## Серада, 26 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10 Камедыя «Камінны госць».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны». 1-я серыя.*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Сваты-5».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Сямейны ачаг».*****
**16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**22.05 Серыял «След».*****
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Вагончык мой далёкі».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.50** Тэлебарометр.
**9.05, 18.05 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.15, 17.05 Серыял «Анжаліка».*****
**12.20, 20.05** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.00, 21.40, 22.05** «Паненкасялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.55 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****

**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.35** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Клёцкі з душамі. Цыбрыкі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.05, 20.15, 23.10** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Драма.***
**9.35, 13.35 «Рэйнджар з атамнай зоны». Маст. фільм.*****
**11.00** М/ф.0
**11.05, 15.10 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў.**
**«Судны дзень». 1-я серыя.*****
**12.20** «Мастацтва Беларусі-1976» (лістапад).
**12.30** «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Юрый Фейгін.
**12.55** «Кіно і час». Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.
**16.05, 21.05** «Чарнобыль. Разбураны міф». Дак. фільм.*
**16.45, 21.40 «Загад: агонь не адкрываць». Драма.***
**19.30** «Легенды беларускай эстрады». «Музыка зорак». Тамара Раеўская.
**20.20** «На прыродзе з Віталем Гуменным».
**20.40** «Калыханка».
**23.15** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**8.00** Фехтаванне. Чэмпіянат Еўропы. U-23. Камандныя спаборніцтвы. Шпага. Жанчыны. Шабля. Мужчыны. Рапіра. Жанчыны.
**9.45** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**10.15** Спорт-кадр.
**10.45** Козел пра футбол.
**11.05** Хакей. КХЛ. Найлепшыя матчы сезона 2016—2017. ЦСКА (Масква) — «Металург» (Магнітагорск).
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт.
**17.55, 22.25** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Шахцёр» (Салігорск) — ФК «Слуцк». (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**19.55** Слэм-данк.
**20.25** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Брэст). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прысуд».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Драма «Вялікая».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35** «На ноч гледзячы».
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Усім па катку».
**8.40 «Ціхі цэнтр». Серыял.**
**10.40 Маст. фільм «Салодкае развітанне Веры».***
**12.30** «Дакументальны праект»: «Анёл безнадзейных».
**13.50** «Самая карысная праграма».
**14.45, 17.35** «Званая вячэра».

**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Вадзіць па-руску».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Тайны Чапман».
**23.55 Маст. фільм «Найлепшая пара года».*****
**1.25** «Дакументальны праект»: «Прыстанак багоў».

### МІР

**6.50** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Маст. фільм «Свінарка і пастух».**
**10.30 Маст. фільм «Добры дзень Вам!»*****
**12.30** «Любімыя акцёры 2.0», «Службовы раман».*
**13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.50 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.10 Маст. фільм «Удача напракат».***
**0.05** Дак. цыкл «Першыя».*
**0.35 Серыял «Спрут».*****
**2.35 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**

**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**22.00, 23.10 Серыял «Апты-місты».**
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТВ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Кватэрнае пытанне».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45** «За гранню».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Наша шчаслівае заўтра».*****
**22.25** «Выні́кі дня».
**22.55** «НЗ.by».
**23.15 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.15** «Сябры Дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Меладрама «Афіцэр з ружай».**
**13.00, 19.20 Серыял «Легенды».**
**14.25 Серыял «Палацавыя тайны».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.40 Серыял «Каўчэг».**
**18.00 Серыял «Агент Картэр».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Асноўны інстынкт».**
**23.10 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 3.25** М/ф «Тры каты».
**6.50, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.30, 4.25** «Ералаш».
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».
**9.30** Камедыя «Знаёмства з бацькамі».
**11.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.10** «Сэрцы за каханне».
**14.50** «Узважаныя людзі».
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».
**17.50, 23.40** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**20.10** Серыял «Кухня-6».
**21.55** Камедыя «Змешаныя пачуцці».
**0.40** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.00** «Пустая карона: вайна Пунсовай і Белай ружы. Рычард III». Серыял.***
**12.05** Казкі з гліны і дрэва. Дымкаўская цацка.
**12.15, 1.15** «Ці чулі вы?..» Гісторыі з жыцця расійскіх музыкантаў.
**12.55, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.25** «Пешшу...» Балтыка прыбярэжная.
**13.50** «Пяшчотнасць да равучага звера». Маст. фільм. 2-я серыя.

**15.10** Тыдзень Індыі на тэлеканале «Культура». «Ёга — шлях самапазнання».
**15.55** Штучны адбор.
**16.35** «Князь Пацёмкін. Свято і цені». Дак. фільм.
**17.05** «Мікалай Луганскі. Жыццё не па нотах». Дак. фільм.
**17.45** Маскоўскі Велікодны фестываль. Абранае.
**18.35** «Аркестр будучыні».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**21.15** Дзень памяці загінулых у радыяцыйных катастрофах. «Зона маўчання». Дак. фільм.
**22.00** Тыдзень Індыі на тэлеканале «Культура». «Індыйская мадэрнізацыя».
**22.40** 75 гадоў з дня нараджэння Святаслава Бэлзы. «Незададзеныя пытанні». Дак. фільм.
**23.20** Сусветныя скарбы.
**23.55** Мастсавет.
**0.45** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.

### Настальгія

**6.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**7.05** «Сваякі». Фільм-спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Ул. Маякоўскага.***
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 13.00, 14.35, 15.40, 17.00, 19.00, 20.45, 21.40, 23.00, 5.10** Музычная настальгія.*
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Чарнобыль». 2006 год.***
**13.30** Фільм-спектакль «Абяцанне шчасця».***
**18.00** «Сняем, сябры!» з Натальяй Казлякловай. 2005 год.***

**19.40** Маст. фільм «Інспектар Гул». 1-я серыя.***
**0.00** Фільм-канцэрт «Канцэрт гурта «Аліса». 1988 год.***
**1.05** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.***
**1.50** «Рок-н-рол — гэта «Pushking». Канцэрт групы «Пушкинг». 2004 год.***
**3.00** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Усерасійскі рэферэндум аб даверы Б.Н. Ельцыну». 1993 год.***
**4.00** Маст. фільм «Мера стрымання».***

### EuroSport 1

**5.15, 9.35, 1.00** Веласпорт. «Тур Рамандыі».
**6.00** Веласпорт. Гонка «AMSTEL GOLD».
**7.30, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00, 0.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**9.30** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**11.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

**0.55** Камедыя «Машына часу ў джакузі».***
**2.40** Камедыя «Оскар».*
**4.05, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**4.30** Камедыя «Імя».***
**6.30** Фэнтэзі «Пенелопа».*
**8.20** Меладрама «Каханне з рызыкай для жыцця».***
**10.00** Камедыя «Прышэльцы».*
**11.55** Камедыя «Прышэльцы-2: калідор часу».*
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Камедыя «Няўлоўная чацвёрка».***
**18.30** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера», 3-я серыя.*
**19.30** Камедыя «Аднакласнікі».***

**20.55** Камедыя «Вампіршы».***
**22.35** Камедыя «Памятаю — не памятаю».*

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.30** «Доктар І...»
**9.00, 19.00, 2.40** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.30, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.15** «Сляпая».
**13.15** «Варажбітка».
**14.20** «Паралельны свет».
**15.15** «Вайна нявест».
**15.45** «Здзелка».
**16.15** «Натуральны адбор».
**17.10** «Шчыра».
**18.05** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**20.45** «Магазіна».
**21.45** «Рэвізора».
**23.05, 5.30** «Лінія абароны».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Прывідны патруль». Фэнтэзі.***
**1.50** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Смурфікі.*
**8.10** Версальскі раман.****
**10.20** Не здавайся.***
**12.05** Назад у будучыню III.*
**14.20** Кіраванне гневам.*
**16.20** Каханне жыве тры гады.***
**20.10** Чалавек, які змяніў усё.***
**22.50** Паштальён.***
**2.20** Труп нявесты.*
**3.50** Ананім.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Любовь-морковь-2.*
**8.15** Пікавая дама: чорны абрад.***

**10.10** Пуцёўка ў жыццё.*
**12.25** Не бойся, я з табой. 2-я частка.*
**14.20** Высоцкі. Дзякуй, што жывы.***
**16.55** Лёгкі на ўспамін.*
**18.35** Будзь са мной.***
**20.20** Параграф 78.***
**23.00** Мішэнь.****
**2.10** Дурань.***
**4.30** Развод па ўласным жаданні.***

### National Geographic

**6.00, 9.15, 13.10, 20.15** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.40, 10.45, 14.45** Мегазаводы.*
**8.30, 15.30** Шаша праз пекла.*
**10.00** Уварванне на Зямлю.*
**11.35, 16.15, 19.25, 23.20, 2.25** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.25, 17.55, 21.00, 0.55, 4.05** Пачатак.*
**22.30** Прарыў.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 18.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00** Майстры патаргавацца.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**19.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.***
**20.00** Тэхнагеніка.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Мегаперавозкі.*
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## Усходні гараскоп на тыдзень

**АВЕН.** Вас чакае вельмі перспектыўны тыдзень, будуць раптам узнікаць спрыяльныя магчымасці ў прафесійнай сферы. Не выключана, што да сярэдзіны тыдня вас наведаюць цікавыя ідэі або паступяць прапановы, якія варта разгледзець. Вырашайце ўсе справы без мітусні і паспешлівасці. У чацвер неабходна паказаць сваю ініцыятыўнасць і смеласць. Праявіце максімум вытрымкі пры зносінах з дзецьмі.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні не пажадана гуляць у хованкі з начальствам і прадстаўнікамі закона і парадку, вы ўсё роўна прайграеце. Надыходзіць спрыяльны час для паездак, падарожжаў, экскурсій. Вы зможаце зірнуць на многія рэчы па-новаму і ўбачыць тое, што раней не заўважалі, гэта надасць упэўненасць у сваіх магчымасцях. У пятніцу пастарайцеся пазбягаць канфліктаў, не парушаць ніякімі дзеяннямі камфорту і міру ў душы. Суботу прысвяціце сабе, займіцеся самаадукацыяй.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні з'явіцца магчымасць вырашыць цяжкае, але важнае пытанне. Удалымі будуць перамовы з новымі партнёрамі, магчымыя таксама і недзелавыя знаёмствы. Пачатыя раней справы будуць паспяхова прасоўвацца. Чацвер можа стацца актыўным і насычаным днём, з'явіцца магчымасць рызыкнуць і дамагчыся поспеху, але галоўная задача — не паддавацца эмоцыям. У пятніцу для дасягнення мэт набярыцеся цярпення. Выхадныя — добры час для сустрэчы з сябрамі і правядзення якіх-небудзь забаўляльных мерапрыемстваў.

**РАК.** На гэтым тыдні пажадана загадзя скласці падрабязны план спраў і сустрэч і імкнуцца не змяняць яму. У аўторак пры вырашэнні прынцыповых пытанняў цвёрда адстойвайце свае перакананні. У сераду і чацвер у вас будзе атрымлівацца любая работа. Старайцеся не прапускаць важную інфармацыю, якая датычыцца асабістага жыцця. У суботу не расслабляйцеся, давядзіце да канца ўсе справы, запланаваныя на гэты тыдзень. У нядзелю сачыце за сабой, не дазваляйце раздражненню выплюхвацца вонкі.

**ЛЕЎ.** Магчыма, час разгрузіць свае плечы ад чужых праблем. Тут жа з'явіцца магчымасць заняцца сваімі ўласнымі. Перагледзьце свой гардэроб на прадмет вясновага абнаўлення. У чацвер калегі могуць звярнуцца да вас у пошуках справядлівасці. Паспрабуйце не падмануць іх чаканняў. Пятніца, хутчэй за ўсё, будзе насычаным днём, таму не хапайцеся за ўсё адразу, лепш сканцэнтруйце намаганні на нейкай адной справе, і тады ўсё атрымаецца. У выхадныя самы час сабраць гасцей і здзівіць іх кулінарнымі шэдэўрамі ўласнага прыгатавання.

**ДЗЕВА.** Неабходна спусціцца з нябёсаў на зямлю, каб вызначыць свае далейшыя планы і галоўную лінію кар'еры. Вам неабходна звярнуцца па адказ да свайго ўнутранага голасу, бо знешнія дарадчыкі тут бескарысныя. У пачатку тыдня на працы лепш паменш прыцягваць да сябе ўвагі. Ваш дэвіз: «сціплаcць і тактоўнасць». Тады спадарыня Фартуна не забудзецца ўсміхнуцца вам у патрэбны момант. Ёсць верагоднасць атрымаць доўгачаканую вестку ад далёкіх сваякоў або сяброў. Чацвер — не ваш дзень. Паспрабуйце правесці яго ціха і спакойна.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Магчымыя перамены як у асабістых, так і ў прафесійных справах. Не выключана, што поспех вам усміхнецца ў самы нечаканы момант. Не будуйце залішне фантастычных планаў, расчараванне ад няўдачы ў іх рэалізацыі можа прымусіць вас прыняць неабдуманае рашэнне. У чацвер паспрабуйце пазбегнуць удзелу ў спрэчках і канфліктах, лепш адсядзецца ў баку, і праблема хутка вырашыцца сама сабой. Субота — выдатны дзень для прыёму гасцей або паездкі на пікнік.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні ўпэўненасць ва ўласных сілах і аптымізм дапамогуць заваяваць прыхільнасць навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. Самымі спрыяльнымі днямі тыдня абяцаюць быць серада і пятніца. Вы можаце істотна папоўніць свае веды, тым самым падняўшыся на новую інтэлектуальную вышыню. Захоўвайце душэўную раўнавагу. Пад канец тыдня, пасля бесперапыннай мітусні, вас будуць чакаць вельмі прыемныя падзеі. Новыя ўражанні ў выхадныя дні дадуць нагоду для новых задум.



**СТРАЛЕЦ.** Неабходна засяродзіцца на адной галоўнай мэце, тады яна пачне набліжацца да вас. Спрыяльны час для дзеянняў, накіраваных на ўмацаванне сваёй рэпутацыі і павагі сярод калег. У першай палове тыдня магчымыя пэўныя цяжкасці з дзелавымі партнёрамі або мужам, які раптам можа стаць занудам. Праявіце цярпенне і пачуццё гумару, і ўсё наладзіцца.



**КАЗЯРОГ.** Час спрыяльны для рашучых дзеянняў, пераменаў і дакладнага планавання будучых падзей. У панядзелак пажадана пазбавіцца ад грузу дробных нявырашаных праблем. У сераду не прызначайце важных сустрэч. Пачынаючы з серады, у вас будуць з'яўляцца розныя магчымасці, якія спрыяюць завяваванню новых вяршынь. У чацвер вялікая рызыка прапусціць штосьці важнае. У пятніцу пры неабходнасці можаце разлічваць на падтрымку сяброў. У нядзелю паспрабуйце захоўваць раўнавагу і не раздражняцца з-за блізкіх людзей.



**ВАДАЛЕЙ.** Перыядычна давядзецца выпраўляць памылкі, пераробляць частку спраў, вяртацца да адкладзеных заданняў з-за непрадбачаных абставін. Паспрабуйце захоўваць лагічную паслядоўнасць у дзеяннях. Далёка не ва ўсім, што будзе адбывацца ў непасрэднай блізкасці ад вас, варта ўдзельнічаць. Часам лепш маўчаць і ўхіляцца. Звярніце ўвагу на стан сваіх фінансаў, пазбягайце неабдуманых і спантанных выдаткаў.



**РЫБЫ.** Можа з'явіцца шанц далейшага прасоўвання па службе. Пажадана ўстрымлівацца ад любых абяцанняў, бо іх выкананне запатрабуе такіх выдаткаў, дазволіць сабе якія вы пакуль не можаце. Серада — не той дзень, калі варта спрабаваць давесці любую справу да пераможнага канца, вы занадта стоміцеся. У канцы тыдня не варта спрачацца з калегамі і начальствам. Асабліва ўпартыя і працавітыя асобы маюць шанц закласці трывалы падмурак пад будынак уласнага дабрабыту. Будзьце асцярожныя ў аценках, лепш трохі схітрыцца, праявіць дыпламатычнасць, чым у адкрытую нажыць сабе ворага.

## Чацвер, 27 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона X.
**9.10, 22.05 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Позняе раскаянне».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Справа жыцця». Дак. фільм.
**0.45** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Вагончык мой далёкі».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.50** Тэлебарометр.
**9.05, 18.05 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.15, 17.05 Серыял «Анжаліка».*****
**12.25, 20.05** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.10, 21.40, 22.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.55 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**0.35** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Рулька з хрэнам, узвар журавінавы.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 14.35, 20.15, 23.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Драма.***
**9.35, 12.45 «Сустрэча ў гарах». Маст. фільм.***
**10.55** М/ф.0
**11.10, 15.20 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Судны дзень». 2-я серыя.*****
**12.20** «Камертон». Крытык, музыказнаўца Ларыса Барыкіна.
**14.10** «Выйсце ёсць». Вольга Клебановіч.
**14.40** Канцэрт ансамбля песні і танца «Спадчына» Палаца культуры г. Маладзечна.
**16.10, 21.05** «Аперацыя «Загадка». Дак. фільм. 1-я серыя.*
**16.45, 21.45 «Загад: перайсці мяжу». Драма.***
**19.30** «Легенды беларускай эстрады». «Сцэна, я табе верная...» Наталля Гайда.
**20.20** «Мастацтва Беларусі-1977».
**20.30** «На прыродзе з Віталем Гуменным».
**20.40** «Калыханка».
**23.20** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**7.30** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Шахцёр» (Салігорск) — ФК «Слуцк».
**9.15** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Брэст).
**11.05** Хакей. КХЛ. Найлепшыя матчы сезона 2016—2017. «Металург» (Магнітагорск) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт.
**18.50** Слэм-данк.
**19.20** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**19.50** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Вардар» (Македонія) — «Фленсбург» (Германія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**21.35** Козел пра футбол.
**21.55** Авертайм.
**22.25** Баскетбол. Еўраліга. 1/4 фіналу. Чацвёрты матч. «Басконія» (Іспанія) — ЦСКА (Расія). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** Драма «Вялікая».*
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «На ноч глядзячы».
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.15 «Важняк. Гульня на вылет». Серыял.**
**12.30** «Дакументальны праект»: «Прыстанак багоў».

**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «У нас усе дома».
**16.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Званая вячэра».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55** «Дакументальны праект»: «Стваральнікі Франкенштэйнаў».

### МІР

**7.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00, 0.00 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе».***
**10.35 Маст. фільм «Удача напракат».***
**12.30** «Любімыя акцёры», Святлана Немаляева.*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.00 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Заза».*****
**1.40 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.

**22.00, 23.10 Серыял «Аптымісты».**
**1.00** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Дачны адказ».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 22.55** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Наша шчаслівае заўтра».*****
**22.25** «Вынікі дня».
**23.15 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Аб будаўніцтве і нерухомасці».
**10.45** «Сябры Дзядулі Марка».
**11.00 Трылер «Найлепшы стралок».**
**13.00, 19.20 Серыял «Легенды».**
**14.30 Серыял «Палацавыя тайны».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**16.50 Серыял «Каўчэг».**
**18.25 Серыял «Агент Картэр».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Баявік «Шпіён, які мяне кахаў».**
**23.25** Дак. фільм «Ахвярапрынашэнне».

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30, 3.25** М/ф «Тры каты».
**6.50, 3.45** М/ф «Фіксікі».
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.30, 4.25** «Ералаш».
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».
**9.30** Камедыя «Змешаныя пачуцці».
**11.10** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».
**13.00** «Лаві момант».
**13.30, 17.50, 23.40** «Уральскія пельмені».
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-6».
**15.40, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».
**21.55** Камедыя «Мой хлопец — анёл».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**1.50** Серыял «Месяц».
**2.40** «Не можа быць!»

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.00** «Пустая карона: вайна Пунсовай і Белай ружы. Рычард III». Серыял.***
**12.05** Казкі з гліны і дрэва. Каргапольская гліняная цацка.
**12.15, 1.15** «Ці чулі вы?..» Гісторыі з жыцця расійскіх музыкантаў.
**12.55, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.25** «Расія, любоў мая!» «Свет Чукоткі».
**13.50** «Пяшчотнасць да раву чага звера». Маст. фільм. 3-я серыя.
**15.10** Тыдзень Індыі на тэлеканале «Культура». «Індыйская мадэрнізацыя».
**15.55** «Святаслаў Бэлза. Незадаўныя пытанні». Дак. фільм.
**16.35** «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Дак. фільм.
**17.00** Маскоўскі Велікодны фестываль. Абранае.
**18.25** «Аркестр будучыні». Еўратур.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Культурная рэвалюцыя».
**22.00** Тыдзень Індыі на тэлеканале «Культура». «Жывыя гісторыі». Дак. фільм.
**22.30** Сусветныя скарбы.
**22.45** «Аляксей Герман. Сямейны партрэт у інтэр'еры кіно». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**0.45** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Чарнобыль». 2006 год.***
**7.00, 8.35, 9.40, 11.00, 13.00, 14.45, 15.40, 17.00, 18.50, 20.45, 21.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**7.30** Фільм-спектакль «Абяцанне шчасця».***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».*
**12.00** «Сняем, сябры!» з Натальляй Казялковай. 2005 год.***
**13.40, 19.40** Маст. фільм «Інспектар Гул».***
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». Гурты «Цэнтр» і «Вежлівый отказ». 2006 год.***
**23.00** Фільм-канцэрт «Рабіна на каньяку». Гэта вясёлыя «Капуснік». 1989 год.***
**0.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2006 год.****
**1.05** «Сваякі». Фільм-спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Ул. Маякоўскага.***

### EuroSport 1

**4.00, 13.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**4.30, 19.30, 0.05** Веласпорт. «Тур Рамандыі».
**6.00** Веласпорт. Флэш Валонь.
**7.30, 9.30, 13.30, 15.00, 17.00, 21.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**11.00** Гольф. Hassan II Trophy.
**11.30** Гольф. Еўрапейскі тур.
**11.45, 0.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**11.50** Watts.Топ-10.
**12.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету па эстафетках.
**18.00** Футбол. «ФІФА».
**18.30, 1.30** Веласпорт. Класіка.

### Кінакамедыя

**0.00** Камедыя «Няголеныя».***
**1.40** Меладрама «Персанаж».*
**3.40, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**4.45** Меладрама «Па той бок».***
**6.40** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».***
**8.30** Камедыя «Як снег на галаву».***
**10.15** Камедыя «Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі».*
**12.20** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы».0
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.40** Камедыя «Пяць нявест».***
**18.35** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера», 4-я серыя.*

**19.30** Меладрама «Як займацца каханнем па-англійску».****
**21.20** Меладрама «Былыя: найлепшыя сябры!»***
**23.10** Меладрама «Каханне з рызыкай для жыцця».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.20** «Доктар І...»
**8.50, 19.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.20, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.00** «Сляпая».
**13.00** «Варажбітка».
**14.05** «Паралельны свет».
**15.05** «Вайна нявест».
**15.35** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05** «Шчыра».
**18.00** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**20.50** «Спатканне з зоркай».
**22.00** «Рэвізора».
**23.10, 5.30** «Алігарх ТБ».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Авіятар». Драма.***
**3.10** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Хоць раз у жыцці.***
**8.10** Паштальён.***
**11.30** Чалавек, які змяніў усё.***
**14.05** Ананім.***
**16.35** Труп нявесты.*
**20.10** Знесеныя ветрам.*
**0.15** Параноя.*
**2.20** Манглхорн.***
**4.20** Лофт.****

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Доўгае шчаслівае жыццё.***
**8.00** Параграф 78.***
**10.40** Сірата казанская.

**12.25** Дазнанне пілота Піркса.*
**14.25** Дурань.***
**16.50** Развод па ўласным жаданні.***
**18.40** Жыць.***
**20.20** Мама.***
**22.25** Нязлоўныя: джэкпот.***
**0.15** Сухадол.***
**2.20** Стаўка на каханне.*
**4.20** Любовь-морковь.*

### National Geographic

**6.00, 13.20, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 11.05, 14.55** Мегазаводы.*
**8.45, 15.40** Ледзяная дарога.*
**9.30, 12.35, 18.45, 21.45, 1.35, 4.45** Пачатак.*
**10.15** Ліній Наска: расшыфравана.*
**11.50, 16.25, 19.30, 23.20, 2.20** Расследаванні авіякатастроф.*
**18.00, 21.00, 0.50, 4.00** Аўта-SOS.*
**22.30** Прарыў.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 19.00** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00** Бітвы робатаў.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.*
**18.00** Як пабудаваць... што заўгодна.*
**20.00** Вялікая нафта Іракa.*
**0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**1.00, 6.20** Будаўнікі караблёўгігантаў.*
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №16

Сёлета ў маі адзначае 60-годдзе вядомы беларускі шахматны кампазітар Іван Бондар. Нарадзіўся Іван Міхайлавіч у Ганцавічах Брэсцкай вобласці. Захапіўся шахматамі яшчэ ў школьныя гады, удасканальваўся ў старажытнай гульні ў час вучобы на фізіка-матэматычным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння ВНУ вярнуўся на Ганцаўшчыну, не адно дзесяцігоддзе выкладаў у мясцовых школах, працаваў і шахматным трэнерам. Захапляецца вершамі і музыкай, бардаўскай песняй, быў дыпламантам некалькіх фестываляў, у тым ліку выступаючы сумесна з дачкой, якая скончыла кансерваторыю.

Іван Бондар пачынаў шлях у шахматах са звычайных школьных і студэнцкіх турніраў. Потым досыць паспяхова гуляў у спаборніцтвах па перапісцы, у 1982 годзе стаў віцэ-чэмпіёнам Брэсцкай вобласці. Вось адна з «завочных» партый берасцейца.

А. Бандарэнка — І. Бондар. 1.e4 c5 2.Kf3 e6 3.d4 cd 4.K:d4 Kf6 5.Kc3 Kc6 6.Kdb5 Cb4 7.a3 C:c3+ 8.K:c3 d5 9.ed ed 10.Cd3 0-0 11.0-0 h6 12.Cf4 d4 13.Kb5 Kd5 14.Фf3 Лe8 15.Cg3 Ce6 16.Kd6 Лe7 17.Лfe1 Лd7 18.Ke4 Фf8 19.Kd2 Лe8 20.Лe2 g5 21.h3 Фg7 22.Лae1 Лee7 23.Ke4? g4, 0:1.

У 1973 годзе Іван Бондар пачаў выступаць на старонках абласных і рэспубліканскіх выданняў са сваімі кампазіцыямі. Пачынаў з задач, адну з якіх, адзначаную пахвальным водгукам у конкурсе, прапануем чытачам для самастойнага рашэння *(гл. дыяграму).*



**Белыя:** Kpg8, Фc7, Ce8, nf.4 (4).
**Чорныя:** Kph6, Лg4, пg.7 (3).
Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

Але найбольшых поспехаў дасягнуў Іван Міхайлавіч у складанні эцюдаў, дзе, у адрозненне ад задач, белым трэба дасягнуць выйгрышу або нічыёй, а не паставіць мат у пэўную колькасць хадоў. У эцюдным раздзеле шахматнай кампазіцыі Іван Бондар тройчы станавіўся чэмпіёнам Беларусі, двойчы — віцэ-чэмпіёнам. Усяго надрукаваў звыш 200 эцюдаў, з якіх больш за 75 адзначаны ў конкурсах.

Наступны эцюд І. Бондара — найвышэйшае спартыўнае дасягненне аўтара. Выступаючы ў складзе зборнай СССР на чацвёртым камандным чэмпіянаце свету, беларускі складальнік заняў з гэтай кампазіцыяй першае месца сярод эцюдыстаў, а ў камандным заліку таксама стаў чэмпіёнам свету (што цікава, канчатковыя вынікі першынства былі падведзены ў 1992 годзе, калі Савецкага Саюза на палітычнай карце свету ўжо не існавала).

**Белыя:** Kph5, пп. a2, b6, c3, c7, d7, e2, e3, e5 (9).
**Чорныя:** Kpb2, Лg2, Лg8, пп. f4, f5 (5).
**Выйгрыш.**

Рашэнне выглядае так: 1.d8Ф Лh2+ 2.Фh4 Лhg2 3.Ф:f4 Лh8+ 4.Фh6 Лhg8! 5.Фf6 Лh2+ 6.Фh4 Лhg2 7.Фb4+ Kpa1! 8.Фf4! Лh8+ 9.Фh6 Лhg8 10.Фf6! Лh2+ 11.Фh4 Лhg2 12.Фh1+! і 13.Ф:g2 з выйгрышам.

Іван Бондар — майстар спорту па шахматнай кампазіцыі. Двойчы быў чэмпіёнам Беларусі па вочным рашэнні кампазіцый. Выступаў і ў ролі шахматнага арбітра, у тым ліку ў 1997 годзе арганізаваў адзінае пакуль што першынство Брэсцкай вобласці па рашэнні задач і эцюдаў.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Kb4 (пагроза 2.Cb7+) Kpb8 2.Kc6, 1...Kd7 2.Лe8+.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 28 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 17.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Меладрама «Позняе раскаянне».*****
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Каб убачыць вясёлку, трэба пераждаць дождж».*****
**1.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.50** Тэлебарометр.
**9.05, 18.05 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.15, 17.05 Серыял «Анжаліка».*****
**12.20, 20.00** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**21.40, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон».
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.55 Трылер «З мяне хопіць!»*****

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Куханы.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 16.00, 20.15, 23.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Доўгая дарога ў дзюнах». Драма, заключная серыя.***
**9.35 «Пакаянне». Драма.***
**12.20** «Сіла веры».
**12.50 «Бобі». Камедыя.*****
**15.35** «Выйсце ёсць». Уладзімір Цэслер.
**16.05, 21.05** «Аперацыя «Загадка». Дак. фільм. 2-я серыя.*
**16.40, 21.40 «Тарпеданосцы». Драма.***



**19.30** «Легенды беларускай эстрады». Спадчына Ігара Лучанка.
**20.20** «Мастацтва Беларусі-1978».
**20.30** «На прыродзе з Віталем Гуменным».
**20.40** «Калыханка».
**23.20** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**8.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт.
**10.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Вардар» (Македонія) — «Фленсбург» (Германія).
**12.05** Хакей. КХЛ. Найлепшыя матчы сезона 2016—2017. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Ак Барс» (Казань).
**14.00** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**14.30** Авертайм.
**15.00, 19.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. 1/4 фіналу.
**18.50** Піт-стоп.
**19.20** PRO спорт. Навіны.
**21.20** Змешаныя адзінаборствы. Fight Nights. Global 64.
**23.50** Плаванне. Чэмпіянат Беларусі.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына».**
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Шчаслівыя выпадкі».***
**23.10** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 23.55 «Важняк. Гульня на вылет». Серыял.**
**12.30** «Дакументальны праект»: «Стваральнікі Франкенштэйнаў».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35** «У нас усе дома».
**16.05** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Адкрытая размова».
**17.35** «Званая вячэра».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
